**Васіль СТАРЫЧОНАК**

# *«ТВАРЫЦЬ – ШТОДЗЁННА, АПАНТАНА – ДЛЯ ЧАЛАВЕКА ЗНАЧЫЦЬ – ЖЫЦЬ»:* ДЗЕЯСЛОВЫ СТВАРАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў БЕЛАРУСКІМ МАСТАЦКІМ ДЫСКУРСЕ

*Жыццё даецца, каб жыццё тварыць,*
*Не марнаваць, не нішчыць, не бурыць, –*
*Тварыць!*

Анатоль Вярцінскі

Чалавецтва дасягнула высокага ўзроўню ў матэрыяльным, культурным і навуковым развіцці дзякуючы стваральнай дзейнасці чалавека. Стварэнне лічыцца вышэйшай з вядомых чалавеку форм станоўчай змены рэальнасці, накіраванай на ўдасканаленне свету і паляпшэнне жыцця чалавека. У шырокім сэнсе стварэнне – гэта не столькі будаўніцтва і эксплуатацыя матэрыяльных аб’ектаў, колькі валявая, свядомая і духоўная дзейнасць чалавека. Яна носіць пазітыўны характар і прыводзіць да ўзнікнення чагосьці канструктыўнага, карыснага, гарманічнага, прыносіць людзям дабрыню, матэрыяльную, практычную, душэўную, духоўную, карысць, робіць свет больш гарманічным. Стварэнне – гэта рухаючая сіла, рост, развіццё, дасягненне мэты.

Адначасова са стваральнай дзейнасцю існуе і разбуральная, дэструктыўная дзейнасць, ілюстрацыяй якой з’яўляюцца бесперапынныя войны, варварскія набегі і дзеі па знішчэнні старажытных культур, узмацненне тэрарыстычных актаў, розныя катаклізмы сацыяльнага характару, распаўсюджванне каронавіруса і інш. Разбурэнне – працэс, які ўздзейнічае на матэрыяльныя аб’екты і прыводзіць да пагаршэння яго ўласцівасцей, якасцей ці поўнага знішчэння. У матэрыяльным свеце практычна няма такога аб’екта, які з цягам часу не быў бы знішчаны.Таму разбурэнне можна разумець як нейтральны натуральны працэс у глабальным і прыватным разуменні светабудовы. Некаторыя віды разбуральнай дзейнасці з’яўляюцца важным элементам абрадавых і рытуальных актаў. Напрыклад, калі хтосьці з аднавяскоўцаў забываў на полі барану, дзяўчаты павінны былі разламаць яе на невялікія часткі, у адваротным выпадку на працягу года ні адна з дзяўчын гэтай вёскі не выйдзе замуж. У сваю чаргу разламаныя рэчы заўсёды прадказвалі бяду. Так, хлеб, які трэснуў у печы, прадвяшчаў вельмі дрэнныя навіны ў сям’і.

Стваральнасць і разбуральнасць як два процілеглыя паняцці часта называюць канцэптуальнай дыядай, двума полюсамі, двума бакамі аднаго медаля. І сапраўды гэта так. Стварэнне і разбурэнне з’яўляецца адзіным працэсам перамен, бо ў многіх выпадках без разбурэння немагчыма стварэнне. Таму разбурэнне ўмногіх выпадках лічыцца чарговым этапам трансфармацыі. Так, прырода дэманструе вялікую колькасць прыкладаў бесперапыннага разбурэння і аднаўлення пры змене сезонаў. Восень,

напрыклад, знішчае зеляніну і лістоту з дрэў, робіць сонца цьмяным і ночы доўгімі. Вясна разбурае снежнае покрыва і дае магчымасць зямлі заквітнець буйствам фарбаў і пахаў. Лета знішчае вясну і памірае перад восенню. Доўгі дзень праганяе змрок і забівае моцны холад. І так доўжыцца кожны год. У прыродзе мы бачым прыклады страшных разбурэнняў, якія ачышчаюць зямлю і ствараюць глебу для новых узнікненняў: пасля праліўных разбуральных дажджоў назіраецца росквіт расліннасці ў кліматычным рэжыме саваны. Тарнада, землятрасянні, цунамі, паводкі разбураюць ранейшы ландшафт, пакідаючы пустэчу на сваім шляху. Пасля на гэтых жахлівых разбурэннях узнікае новае жыццё з яго новымі формамі і магчымасцямі. Працэсы разбурэння і стварэння пастаянна рухаюць і відазмяняюць свет. У вядомым выразе *ламаць – не будаваць* завастраецца ўвага на тое, што зламаць што-небудзь не патрабуе вялікіх намаганняў, а пабудаваць, стварыць штосьці новае патрабуе многа сіл і энергіі. Беларускі паэт Анатолій Балуценка гаворыць пра гэта так:

*Ламаць – не будаваць, такая думка*
*Пранесена фальклорам праз вякі*
*І цягнецца дагэтуль, нібы гумка,*
*Бо зразумелы сэнс яе такі.*

*Ламаем лёгка сем'і і дзяржавы,*
*Але не навучыліісь будаваць,*
*Такі набытак не прыносіць славы,*
*Ды славы не жадаем мы чакаць.*

*Ламаем ўсё, што пападзе пад рукі,*
*Або псуем, як цяжка паламаць,*
*Бацькі ламаюць, дзеці і унукі,*
*Без працы рукі моцныя гараць.*

Стварэнне – гэта працэс выкарыстання і трансфармацыі энергіі і рэсурсаў для атрымання канчатковага выніку. У агульным сэнсе, стварэнне – гэта пачатак чагосьці новага, з чаго ўсё пачынаецца. Гэта і пачатак жыцця, і пачатак навучання, і пачатак узвядзення.

Адным з найбольш распаўсюджаных сродкаў рэпрэзентацыі катэгорыі «ствральнасць» з'яўляюцца дзеяслоўныя адзінкі са значэннем стварэння, будавання, узвядзення, уздзеяння, майстравання, фарміравання, змянення, якія займаюць асноўнае месца ў шырокім семантычным класе дзеяясловаў пераўтваральнага ўздзеяння на аб'ект. У беларускай літаратурнай мове налічваецца некалькі дзясяткаў дзеясловаў, сэнсавыя структуры якіх аб'яднаны агульным інварыянтным значэннем 'стваральная дзейнасць'. Такая дзейнасць звычайна прыводзіць да стварэння новага аб'екта ці рэканструкцыі ўжо існуючага аб'екта.

У залежнасці ад спецыфікі першасных «стваральных» ЛСВ вылучаецца некалькі груп лексічных адзінак. Гэта дзеясловы а) з шырокім абагульненым

(*стварыць, пабудаваць, змайстраваць, узвесці*) і вузкім, больш канкрэтным (*ткаць, прасці, ляпіць, каваць*) значэннямі; б) дзеясловы-ўказальнікі на стварэнне новага цэласнага аб’екта (*пашыць, пабудаваць, зляпіць*) і маніпулятыўныя дзеясловы, у выніку дзеяння якіх адбываецца перабудова, ўжо існуючага аб’екта, яго канструктыўнае ці характаралагічнае відазмяненне (*адрамантаваць, перарабіць, перабудаваць, інкруставаць*); в) дзеясловы фізічнай (*свідраваць, выразаць, каваць*) і інтэлектуальнай (*сканструяваць, намаляваць, напісаць, распланаваць, начарціць*) дзейнасці і інш.

## ДЗЕЯСЛОВЫ З АБАГУЛЬНЕНЫМ ЗНАЧЭННЕМ СТВАРЭННЯ

Група дзеясловаў з абагульненым значэннем стварэння ўключае намінацыі *стварыць*, *рабіць, сабраць, будаваць, майстраваць* і інш. У сэнсавых структурах такіх слоў адсутнічае указанне на канкрэтны аб’ект, спосаб ці інструмент дзеяння. Практычна любы дзеяслоў з шырокай і абагульненай семантыкай можа выступаць у якасці ідэнтыфікатара і выражаць больш вузкае і канкрэтнае значэнне. Па прычыне абагульненасці і пэўнай абстрактнасці такія дзеясловы патрабуюць абавязковай канкрэтызацыі, удакладнення свайго зместу за кошт семантыкі іншых слоў, з якімі дзеясловы спалучаюцца. Так, канкрэтнае значэнне дзеяслова *майстраваць* ‘рабіць, вырабляць што-небудзь (звычайна ручным спосабам)’ рэалізуецца ў кантэкставых стуацыях тыпу *майстраваць (драбіны, лодку, граблі, лыжкі, вулей, лаўку), майстраваць сякерай, майстраваць на кухні, майстраваць лоўка, майстраваць цэлы дзень* і інш.

Канкрэтнае сэнсавае напаўненне дзеяслова *стварыць* выяўляецца ў наступных сінтаксічных канструкцыях: *стварыць фірму, стварыць штучны спадарожнік Зямлі, стварыць клуб аматараў фантастыкі, стварыць цудоўную кнігу, стварыць умовы для працы, стварыць пазітыўнае стаўленне да гэтай задумы, стварыць «жывы» вобраз беларускага селяніна, стварыць цяжкасці.* Пашыранымі з’яўляюцца наступныя ЛСВ гэтага дзеяслова:

‘пабудаваць, узвесці’: *Мы зноў цябе стварылі, родны горад.* (П. Панчанка); *Ён ішоў па горадзе, які сам стварыў, збудаваў.* (Л. Дайнека); *На беразе магутнай ракі створана новае паселішча.* (М. Ткачоў);

‘арганізаваць, сфарміраваць’: *Настаўнік геаграфіі стварыў турыстычны гурток.* (У. Арлоў); *Яна стварыла беларускі хор, які з поспехам выступаў на многіх сцэнах.* (Я. Сіпакоў); *Аматары збіраліся стварыць мясцовы музей.* (А. Кудравец); *Трэба было стварыць партызанскую групу з мясцовага насельніцтва.* (І. Чыгрынаў); *Андрэй і вясковая дзяўчына Ганна збіраюцца пабрацца, стварыць новую сям’ю.* (М. Тычына);

‘падрыхтаваць, забяспечыць што-небудзь, зрабіць магчымым што-небудзь’: *Мы створым вам усе ўмовы, каб праект быў своечасова завершаны.* (Л. Гаўрылкін); *Трэба стварыць нармальныя, здаровыя ўмовы для супрацоўнікаў.* (А. Дзялендзік); *На кавалкі разрывалася Дуня, каб стварыць атмасферу весялосці і ўцягнуць у яе малазнаёмага тут новага*

*настаўніка.* (Я. Колас); *Сваім героям якія дзейнічаюць у творы, аўтар павінен стварыць такія сітуацыі, дзе б героі маглі сябе найбольш выявіць.* (К. Чорны).

Стварэнне – гэта валявая і духоўная дзейнасць чалавека, спасціжэнне ім існасці, адказнасці за даручаную справу. Па гэтай прычыне дзеяслоў *стварыць* ужываецца ў адносінах да нематэрыяльных аб'ектаў, маральных каштоўнасцей, духоўнага свету чалавека. Ён, як правіла, адзначаны станоўчымі маркерамі канструктыўнасці, каштоўнасці, гарманічнасці, натхняльнасці і звязаны з узнікненнем чагосьці велічнага, прыгожага і цэннага. Сведчаннем гэтага з'яўляюцца наступныя метафарычныя ЛСВ:

'працаваць, займацца стваральнай працай': *У Менску Арлоў тварыў гэтак жа апантана і працавіта, паспяваў паўсюль.* (А. Аркуш); *У нас тварылі Будны і Цяпінскі.* (У. Караткевіч); *Музыка ляцела праз адчыненае акно ў бор, у неба, пад якім жыў і тварыў незабыўны мастак.* (В. Карамазаў);

'стварыць у працэсе творчай дзейнасці': *Уладзімір Лявонаў стварыў тэорыю пруткоўвага квантавага асяроддзя.* (Э. Луканскі); *Міхаіл Высоцкі праславіўся як канструктар, што стварыў беларускую школу канструявання.* (А. Высоцкі);

'вынайсці, пакласці пачатак': *Я нават стварыў зусім новыя гібрыды клетак.* (А. Якімовіч);

'напісаць навуковы, літаратурны, музычны твор, карціну': *Мастака хвалюе задума стварыць карціну-эпас роднага Палесся.* (В. Карамазаў); *Драматург Галубок стварыў тады меладрамы «Апошняе спатканне» і «Бязвінная кроў», вадэвіль «Пісаравы імяніны».* (Я. Дыла); *Жыццёвыя назіранні дапамаглі яму стварыць серыю апавяданняў.* (В. Быкаў); *Тулуза Латрэка – вялікі мастак, які стварыў геніяльныя палотны.* (В. Супрунчук);

'намаляваць мастацкі вобраз сродкамі мовы': *Маладому пісьменніку ўдалося стварыць некалькі жывых вобразаў людзей.* (І. Мележ); *Наша проза і драма стварылі выдатныя ўзоры тыпаў і вобразаў.* (К. Чорны); *Някрасаў жа першым з рускіх паэтаў стварыў вобраз мужыка-беларуса ў сваім славутым вершы «Чыгунка».* (А. Лойка); *Шматграннасць таленту дапамагла стварыць мноства запамінальных сатырычных характараў.* (В. Праўдзін);

'быць прызначаным для чаго-небудзь па прычынне сваіх асаблівасцей': *Чалавек створаны для любові.* (У. Караткевіч); *І ўсё ж чалавек створаны для фізічнай працы.* (Л. Гаўрылкін); *Неба створана для ўсіх, у каго ёсць крылы.* (Л. Дайнека); *Песня была створана для праекта «Я нарадзіўся тут».* (Л. Вольскі);

‘прыдумаць, уявіць сабе’: *Я стварыў у сваім уяўленні тыя мары аб таварыстве, дружбе, якія гадую ў сэрцы.* (М. Зарэцкі); «*А я мару сустрэць каханне, – сказала пухленькая дзяўчына гадоў васемнаццаці, –я ўжо стварыла вобраз свайго каханага».* (Л. Адамовіч).

У асобных выпадках дзеяслоў *стварыць* утрымлівае негатыўную канатацыю і ўказвае на дзеянні, якія выклікалі з’яўленне чаго-небудзь дрэннага, асуджальнага ці сталі прычынай адмоўнай рэакцыі: *Проста стварыў сабе дурацкі настрой.* (М. Зарэцкі); *У Чубаравай душы выгляд гэтай блізкасці раптам стварыў непрыемнае ўражанне, якое ў сваю чаргу выклікала раўнівае і помслівае пачуццё.* (І. Чыгрынаў); *Вакол гэтай паперкі хтосьці наўмысна стварыў мітусню і паніку.* (В. Праўдзін).

Вытворныя ЛСВ дзеяслова *сабраць* аб’яднаны агульнай інварыянтнай семай ‘збіральніцтва, аб’яднаннне, канцэнтрацыя, злучэнне’. Вытворныя ЛСВ у сваёй большасці арыентаваны на выражэнне прадметных дзеянняў. У той жа час многія з іх характарызуюцца антрапаморфнай скіраванасцю і ўказваюць на пэўныя аб’яднанні людзей: *Альберт сабраў усіх военачальнікаў.* (Л. Дайнека); *Дарафеевічу прапанавалі напачатку сабраць мясцовую інтэлігенцыю, пагаварыць з ёй на сходзе.* (І. Чыгрынаў); *Пасля мы паставім вакол гэтай вёскі вартавых і збяром людзей.* (У. Федасеенка); *Дырэктар загадаў сабраць рэдакцыю і растлумачыць рашэнне бюро па зборніку Трошына.* (У. Дамашэвіч); *Праз гадзіну Зыль сабраў свой нешматлікі калектыў.* (У. Шыцік).

Антрапамарфічным з’яўляецца ЛСВ ‘унутрана мабілізаваць сябе для чаго-небудзь’, у сэнсавай структуры якога адлюстроўваюца такія маркеры, як ‘унутраная сіла, моц, воля, энергія чалавека’: *І было такое адчуванне, быццам трапіў у глыбокі калодзеж і, нарэшце, сабраўшы апошнія сілы, вылез з гэтай цемры.* (В. Супрунчук); *Сабраў сілы, падняўся, але Золатаў загарадзіў дарогу да дзвярэй.* (І. Шамякін); *Валошын сабраў у адно ўсю сваю вытрымку, каб хоць знешне заставацца спакойным.* (В. Быкаў); *Ды мне не страшна: нешта застанецца пасля мяне ад дум маіх і спраў, ад парыванняў, што ў душы сабраў.* (Г. Бураўкін); *Лукашык намагаўся сабраць свае думкі.* (У. Дамашэвіч).

Першасныя ЛСВ дзеяслова *будаваць* звязаны з будаўніцтвам, узвядзеннем будынка або якога-небудзь іншага будаўнічага аб’екта *(будаваць дом, будаваць масты, гарады будуюць людзі, будаваць шматфункцыянальныя гандлёвыя цэнтры, будаваць транспартную развязку*). Сфера будавання пашыраецца не толькі на будаўніцтва пэўных аб’ектаў, але і на выраб механізмаў, выпуск машын і інш. (*будаваць танкі, будаваць электрастанцыю*), на майстэрства, уменне вырабляць што-небудзь (*птушкі будуюць гнёзды, бабры будуюць хаткі*). Будаўнічая тэрміналогія лёгка праецыруецца на здольнасць, уменне вырабляць што-небудзь на паперы (геаметрычныя фігуры, схемы, фразы, сказы) ці ў вусным маўленні або ў думках, пры гэтым выяўляючы майстэрства выкарыстоўваць зададзеныя параметры, пэўную паслядоўнасць, сістэму, лагічную сувязь і

інш. (*будаваць квадрат, будаваць маленькі трохвугольнік, будаваць схему сказа, будаваць фразу, будаваць стройны сюжэт, будаваць кар'еру*).

Пераносныя ЛСВ дзеяслова *будаваць* аб'ядноўваюцца некалькі семамі, у залежнасці ад якіх вылучаюцца тры групы намінацый. У першай з іх актуалізуюцца семы 'асноўваць, базіраваць на чым-небудзь': *Колькі іх было ў гісторыі, «вялікіх» і дробных цынікаў — «інквізітараў», што будавалі свае разлікі на слабасці, на баязлівасці людзей.* (А. Адамовіч).

У другой групе пераносныя ЛСВ носяць стваральны характар і ўказваюць на фарміраванне, арганізацыю новага грамадства, новага ладу жыцця, будучыні народа: *Будуем мы свой кут бацькоўскі.* (П. Броўка); *Прыехалі паглядзець, што ў нас робіцца, як мы будуем тут новае жыццё.* (Я. Брыль); *Мы на вахту працы сталі, мір будуем на вякі.* (А. Астрэйка); *Трэба будаваць новае жыццё.* (Л. Родзевіч); *Нельга будаваць будучыню без памяці аб мінулым.* (В. Быкаў); *А мы будуем шчасце чалавеку.* (П. Глебка).

ЛСВ трэцяй групы носяць ментальны характар і звязаны з разумовай дзейнасцю, лагічным мысленнем і планаваннем, намерам, задумай чаго-небудзь, пэўнай здагадкай: *Яны з Андрэем і Плахаю будавалі шмат смелых планаў.* (Ц. Гартны); *Драгун і Вера ўсё шапталі адно другому ўсялякае глупства, будавалі планы.* (У. Дамашэвіч); *Яны ўспаміналі нядаўняе мінулае і адначасова будавалі планы на будучыню.* (А. Васілевіч).

Да ліку дзеясловаў шырокай семантыкі адносяцца лексічныя адзінкі са значэннем надання пэўнай формы (*утварыць, упарадкаваць, аформіць, скласці, саставіць, сфарміраваць),* якія характарызуюцца высокай ступенню генералізацыі і здольнасцю абазначаць дзве нерасчлянёныя акцыі – дзеянне (працэсуальнасць) і яго вынік. Межы паміж асобнымі ЛСВ такіх дзеясловаў невыразныя, размытыя, сінкрэтычныя. Канкрэтны змест такіх абагульненых дзеяслоўных намінацый вызначаецца ў межах пэўных кантэкстаў.

У выніку семантычнай дэрывацыі ў структуры дзеяслова ***ўпарадкаваць у***твараюцца другасныя ЛСВ ментальнага і эмацыянальнага характару, дзе ў якасці суб'екта выступае агенс-антрапонім, які ўказвае на пэўны парадак, лагічнасць думак, разважанняў, іх сістэмны характар, на стрыманасць пачуццяў: *Мне больш падабалася хадзіць на лыжах, бавіць час на самоце, калі я мог упарадкаваць свае думкі.* (Л. Юрэвіч); *Думкі мільгацелі, круціліся, як пчаліны рой, і я дарэмна намагаўся ўтаймаваць, упарадкаваць іх.* (А. Крэйдзіч); *Ён вынасіў веды, упарадкаваў і паволі «аформіў» іх у сваю ідэю.* (Г. Далідовіч); *Сотнік, пастарайцеся ўпарадкаваць свой энтузіязм.* (У. Караткевіч).

Другасныя ЛСВ дзеяслова *ўтварыць* могуць насіць сацыяльны і міжасобасны характар з маркерам ‘нарабіць чаго-небудзь непрыемнага, непажаданага, напракудзіць’: *П'яны чалавек на нашых вачах утварыў глупства, якое закончылася трагедыяй.* (З. Прыгодзіч); *Янінка, цяпер я разумею, што ты не адпусціла б мяне ў падарожжа непадрыхтаванага і не дапусціла б там такога глупства, што я ўтварыў.* (А. Бароўскі).

У мастацкіх тэкстах часам выкарыстоўваюцца розныя прыёмы ўзмацнення сэнсавай нагрузкі выказвання, падкрэслівання неабходнай думкі. З гэтай мэтай ужываюцца паўторы дзеяслова *тварыць* і яго розных форм, а таксама аднолькавых або сінанімічных і блізказначных слоў: *Праца, як вядома,* ***стварыла*** *чалавека, праца* ***стварае*** *і мастака.* (І. Мележ); *Мы —* ***творым*** *і дапамагаем* ***тварыць***. (У. Дубоўка); *Жыць хочацца, жыць!.. Разумець, адчуваць жыццё.* ***Будаваць*** *яго,* ***тварыць***. (М.Зарэцкі); *Менавіта ён* ***стварыў*** *тую жанчыну ў жыцце. І* ***стварыўшы***, *разгубіўся і збянтэжыўся, напалоханы яе прыгажосцю і дасканаласцю.* (В. Казько); *Акцёры,* ***ствараючы*** *жывы вобраз, хацелі б* ***стварыць*** *яго па максімальна дакладнай гістарычнай канве.* (У. Караткевіч); *Пісьменнікі заглыбляліся ва ўласны мастакоўскі свет і* ***тварылі***, ***тварылі***... *Мележ* ***тварыў*** *не тое, што* ***тварыў*** *Паслядовіч, Броўка інакш, чым Куляшоў.* (В. Быкаў).

## ДЗЕЯСЛОВЫ З КАНКРЭТНЫМ ЗНАЧЭННЕМ СТВАРЭННЯ

Дзеясловы канкрэтнага дзеяння характарызуюцца вузкай сэнсавай скіраванасцю і ўказаннем на пэўны від і спосаб дзейнасці, які ўкладваецца ў рамкі такіх абмежаванняў, як мэта, канкрэтны спосаб, прылада (інструмент) дзеяння, а таксама матэрыял, з якога ствараецца аб’ект. У гэту групу ўключаецца звыш 30 дзеясловаў (і іх вытворных адзінак) са значэнннем ткацкай і кравецкай дзейнасці, вязання, тачэння, габлявання, кляпання, свідравання, малявання і інш. Многія з іх характарызуюцца монасемантычнасцю і не выходзяць за межы тэматычнага аб’яднання ‘стварэнне’ (*вылепіць, выпілаваць, выточваць, вышыць, габляваць, майстраваць*). Іншыя дзеясловы характарызуюцца шырокімі сэнсавымі парадыгмамі і ўключаюць у свой склад як першасныя, так і другасныя метафарычныя ЛСВ.

Спецыфіка семантычнай дэрывацыі яскрава выяўляецца ў дзеясловах *ткаць, снаваць, прасці, шыць, кроіць,* звязаных з ткацтвам, прадзівам, кравецтвам. У гэтай лексіцы, якая адлюстроўвае тысячагадовую гісторыю вытворчасці тканіны і палатна, не магла не адлюстравацца цесная сувязь працэса ткацтва і жыцця чалавека, яго думак, меркаванняў, планаў на будучае. У працэс метафарызацыі актыўна ўключаецца дзеяслоў *ткаць* ‘вырабляць тканіну, займацца ткацтвам’, другасныя ЛСВ якога звязаны са светам экзістэнцыі і ментальнасці чалавека: *Жыццё шаўковыя тчэ кросны.* (Я. Купала); *Жыццё свае кросны жалобныя тчэ і будзе ткаць, пакуль яму самі людзі не дадуць асновы з вечнай праўды і братняга мілавання.* (Я.

Купала); *І тчэ жыццё гады.* (Я. Янішчыц); *Думка тчэ свае красёнцы.* (Я. Колас); *А думы ткуць другія ім узоры.* (П. Глебка). Большую нагляднасць і зрокавасць утрымлівае другасны ЛСВ 'ствараць што-небудзь, утвараць нешта складанае, падобнае да прадзіва': *А сонца тчэ свае валокны.* (П. Броўка); *Сонца тчэ вясёлачку з расы.* (І. Канчэўскі); *Сонца тчэ жыцця узор.* (М. Чарот); *І ноч нам тчэ густое пакрывала.* (Я. Колас); *Моўчкі неба праз хмары-аблокі тчэ блакіт па жалезных крыжах.* (В. Бутрым); *Ткуць марозы кужаль белы.* (Я. Колас); *Тчэ кросны павук.* (Я. Купала).

У дзеяслова *снаваць* з першасным значэннем 'рабіць аснову тканіны' другасныя ЛСВ развіліся ў акцыянальным напрамку з актуалізацыяй семы 'рухацца ў розных кірунках, туды і сюды'. Гэта сема перш за ўсё мае дачыненне да руху людзей, жывёл і птушак, розных механізмаў, прыродных і метэаралагічных з'яў: *З хат у двары і з двароў у хаты снавалі людзі, нешта грузілі на падводы.* (А. Кудравец); *Людзі безупынку снавалі то ўзад то ўперад па базарнай плошчы.* (В. Гардзей); *На лугах і жоўтых ад квецені ліпах гулі, снуючы сюды-туды, працавітыя пчолы.* (Я. Баршчэўскі); *Снуюць, мітусяцца сняжынкі, шапоча, віруе, імкне ля ног снегавая віхура.* (У Шчарбак); *Драмала зімовая ноч і снавалі ў вышыні зялёныя, белыя, сінія зоркі.* (В. Быкаў). Іншыя метафарычныя ЛСВ грунтуюцца на дзвюх прыметах, якія дазваляюць сфарміраваць дзве групы экзістэнцыяльных і ментальных дзеяслоўных намінацый:

а) 'закладваць аснову, ствараць што-небудзь': *Снуе жыццё за ніццю сваю ніць.* (Я. Колас); *Так і хочацца заўсёды песню вечную снаваць.* (Я. Купала); *Новую песню складаем-снуём.* (У. Дубоўка); *Арсеннева ў гэты час ужо, здаецца, рэдка снуе мастацкую пражу пра розныя поры году, асабліва восень.* (К. Акула); *Легенду снуюць успаміны.* (П. Глебка);

б) 'мітусіцца, бязладна праносіцца (пра думкі, успаміны)': *Яго думкі бязладна снавалі ў галаве, часам затрымліваючыся на чымсьці далёкім, дробязным.* (В. Быкаў); *Але гэтыя думкі снавалі як бы самі сабою.* (Ц. Гартны); *Як тая пража, снуюць і думкі, і, каб іх льга было наматваць на верацёны, выйшла б не адна ручайка.* (У. Дамашэвіч); *І думка снуе ў галаве*: (Я. Колас).

У дзеяслова *прасці* 'скручваючы (воўну, кудзелю і пад.), рабіць ніткі' другасныя ЛСВ носяць аказіянальны характар і ўказваюць на ход думак, разважанняў, перапляценне дарог, складаныя формы аблокаў: *Хай прадзе пачынкі светлых дум, тчэ сузор'і радаснага прыйсця.* (М. Кавыль); *Прадзе дарогі ніць.* (М. Лужанін); *Прадзеш ты з кужалю аблокаў.* (П. Броўка).

Першасныя ЛСВ дзеясловаў *шыць, прышыць, сшыць* аб'ядоўваюцца інварыянтнай семай 'змацоўваць, злучаць ніткамі, сшываць, прымацоўваць' (*шыць сарочку, шыць боты, шыць гладдзю, шыць шоўкам, прышыць гузік, сшыць сукенку, сшыць кавалкі матэрыі*). Другасныя ЛСВ развіліся толькі ў вытворных дзеясловаў *прышыць, сшыць*, семантыка якіх носіць ярка пеяратыўны характар і ўключае два сэнсавыя маркеры:

а) ‘несправядліва, ілжыва прыпісаць што-небудзь, абвінаваціць у чым-небудзь’: *Ён хоча прышыць настаўніку некаторую долю крамолы.* (Я. Колас); *Сушчэвіч прышыў яму абвінавачанне, што ён падрывае аўтарытэт прадстаўнікоў улады.* (К. Чорны); *Мне прышылі, што гэта я — Міхась Ганько: скрыўся, амаладзіўся.* (Л. Юрэвіч);

б) ‘забіць’: *Не далі вы мне тады контру гэту прышыць.* (А. Асіпенка); *Я б з задавальненнем пазнаёмілася з тым забойцам, каб ён прыйшоў і прышыў цябе за проста так.* (М. Донах).

У дзеяслова *кроіць* ‘разразаць на кавалкі пэўнай формы і памеру матэрыю, шкуру, футра; займацца кройкай’ пераносныя ЛСВ утвараюць два сэнсавыя цэнтры:

а) ‘разразаць цемру, цішыню (пра яркае святло, гукі); *Начныя агні паблісквалі то прыветнымі светлячкамі, то кроілі цемру.. снапамі сваіх фар.* (М. Паслядовіч); *Ноч кроіла цемру на часткі.* (В. Аляксееў);

б) ‘прыносіць душэўны боль, непакой’: *І сэрца кроіў боль скразны.* (Г.Гілевіч); *Мне горача. Не кройце сэрца мне.* (Я. Янішчыц); *Рэжуць-крояць маё сэрца.* (П. Броўка); *Яе пытанні нібы нажом кроілі сэрцы, кожная жанчына ўспаміняла сваё гора.* (П. Місько); *Страшныя думкі кроілі свядомасць.* (В. Мудроў).

У дзеяслова *вязаць* і яго вытворных адзінках фіксуюцца ЛСВ ‘цесна злучаць, змацаваць, абвіваючы чым-небудзь, звязваць’ (*вязаць снапы, вязаць панчохі, вязаць доўгі чырвоны шалік, вязаць сурвэткі, звязаць венікі, звязаць лейцы, звязаць сноп*), ‘плесці кручком, пруткамі і пад.’ (*вязаць рукавіцы, вязаць карункі*), ‘звязваць рукі, ногі, пазбаўляючы магчымасці рухацца’ (*трэба яго звязаць, паліцаі звязалі ім рукі*). Пераносныя значэнні гэтага дзеяслова засноўваюцца на дзвюх інтэгральных семах: а) ‘аб’ядноўваць, звязваць’: *Непараўнальна шмат больш добрага, чым благога, вяжа беларусаў з украінцамі.* (К. Акула); *Жонка і дачка былі самым найдаражэйшым, што вязала яго з Бацькаўшчынай.* (К. Акула); *Цішыня гэтая дае магчымасць успамінаць, вязаць у адно тое найлепшае, што было ў маім жыцці.* (Я. Брыль); б) ‘не даваць волі, перашкаджаць каму-небудзь рабіць што-небудзь’: *Дзеда не вяжуць, як другога, Застылай мудрасці гужы.* (Я. Колас); *Вязала ліха свае сеткі.* (Я. Колас).

На аснове першаснага ЛСВ дзеяслова *плесці* ‘перавіваючы (лазу, ніці, стужкі), злучаць у адно цэлае, выробляць што-небудзь’ (*плесці кошыкі, плесці лапці, плесці вяночкі*) узніклі другасныя ЛСВ, арыентаваныя ў сферу сацыяльных і міжасобасных адносін і сферу маўленчай дзейнасці:

а) ‘гаварыць няпраўду, выдумваць, узводзіць паклёп’: *Рознае плятуць пра жонку Мар’яна ў вёсцы.* (В. Казько); *Канечне, і пра мяне абы-што плялі. Але я надта не браў да галавы.* (Г. Далідовіч); *Ты думаеш, што ты на яе пляцеш? Пачуюць у двары – навек прыліпне да яе гэтая мянушка.* (М. Гроднеў); *Зося яшчэ ўсяго не ведала, што пра яе плятуць.* (К. Крапіва);

б) ‘гаварыць што-небудзь без сэнсу, не думаючы’: *«Ты не пляці абы-чаго, а кажы толкам»,– азваўся Сымон Пятровіч.* (С. Грахоўскі); *Жанчына*

*нешта пляла пра сваю гаспадарку, пра беднасць, пра нейкае гора.* (М. Зарэцкі); *Я пачырванеў і стаў нешта плесці наконт таго, што, маўляў, забыўся дома канспекты.* (З. Прыгодзіч).

На аснове зыходнага ЛСВ дзеяслова *ляпіць* і яго вытворных адзінак *зляпіць*, *вылепіць* 'зрабіць што-небудзь лепкай, вырабіць што-небудзь з мяккага, вязкага рэчыва' ўтвараюцца другасныя ЛСВ, у якіх актуалізуецца пеяратыўная сема 'няякасная, неакуратная праца, што робіцца хутка, на скорую руку': *А раней зляпіць чалавек халупу: мох сабе тырчыць, вуглы сабе, нават канцы бярвення не адпілуе.* (А. Васілевіч); *Ды якая там хата, адна парахня! Зляпіў сяк-так.* (Я. Брыль). Інварыянтнае значэнне 'замацаваць, прыклеіць, прыляпіць' аб'ядноўвае ЛСВ 'прыклейваць, прылеплiваць' (*прыляпіць аб'яву на сцяну*), 'размяшчаць адно за другім, не пакідаючы свабоднага месца' (*ляпіць адну літару за другой*), 'ісці з сілай, прыліпаць (пра мокры снег)' (*снег ляпіў на шыбы, мокры снег ляпіў усю ноч*).

У сэнсавай структуры гэтага дзеяслова развіваюцца энантыясемічныя ЛСВ, якія характарызуюць вынікі творчай працы як са станоўчай, так і з адмоўнай канатацыяй: а) 'ствараць яркія сцэнічныя, літаратурныя вобразы, праўдзівыя характары': *Што дала мне студыя? Яна ўзбагаціла мяне тэхнікай. Адкрыла законы нашай творчасці. Навучыла ствараць вобраз, ляпіць характар, любіць форму і валодаць ёю.* (Ц. Сяргейчык); *Кіно, кіно — спроба зляпіць з жыцця штосьці такое, што будзе вышэй жыцця.* (В. Гігевіч); Я *не прыхарошваў яго, не ляпіў у сваім уяўленні такім, якім хацеў бы бачыць. (*А. Бароўскі); *У аповесці ён лепіць іншыя цудоўныя характары, як бы асвятляючы іх сваім унутраным мастацкім зрокам.* (В. Быкаў); б) 'ствараць нізкапробныя, дрэнныя творы': *Вершы па заказу не пісаліся. Калі і зляпіш які, выглядаў кволым, змардаваным.* (М. Калачынскі); *Яны зляпілі падборку з самых адыёзных і прапагандысцкіх ролікаў.* (В. Савіч).

Дзеяслоў *тачыць* і яго вытворныя адзінкі *вытачыць, адтачыць* 'рабіць вострым рэжучую частку, лязо чаго-небудзь з дапамогай тачыла, бруска і пад.)' у пераносным значэнні ўжываюцца са станоўчай канатацыяй і ўказваюць на ўдасканальванне майстэрства, паляпшэнне якасці творчай дзейнасці: *Багдановіч адтачыў сваё пяро крытыка, тут упершыню бліснуў трапнасцю назіранняў, тонкім пранікненнем у канкрэтныя з'явы літаратурнага працэсу.* (А. Лойка); *Яна адтачыла сваё красамоўства, падрыхтавала кароткую і энергічную прамову.* (У. Васілевіч); *Вучні змогуць адтачыць майстэрства па народна-сцэнічных, гісторыка-бытавых і сучасных танцах.* (І. Ярмолаў).

У сваіх зыходных значэннях дзеясловы *каваць (падкаваць, выкаваць)* абазначаюць дзеянні і працэсы, утвораныя ударамі молата, малатка ці ціскам: 'апрацоўваць распалены метал, надаваць яму патрэбную форму; падкоўваць, акоўваць, закоўваць' (*каваць колы, каваць жалеза, выкаваць серп, падкоўваць коней*). Пераносныя значэнні гэтага дзеяслова выражаюць вынікі настойлівай працы, вялікіх намаганняў у стварэнні чаго-небудзь: *Гэты чалавек каваў перамогу.* (У. Арлоў); *Сярод тых, хто каваў Вялікую Перамогу ў тыле*

*ворага, былі і байцы партызанскіх брыгад.* (В. Савіцкі); *Рабочыя, салдаты, жанчыны сваімі словамі і справай кавалі перамогу.* (П. Глебка); *Людзі самі, сваімі шчырымі рукамі, куюць сваё шчасце, робяць вясну на зямлі!* (А. Бялевіч); *Барацьба з фашысцкім нашэсцем выкавала такія рысы нацыянальнага характару, як свабодалюбства і патрыятызм.* (Д. Кучынскі).

Дзеясловы *кляпаць, скляпаць* выкарыстоўваюцца, як правіла, у сваіх першасных значэннях ‘злучыць, змацаваць пры дапамозе кляпання’, ‘ударамі малатка вастрыць лязо касы’ (*кляпаць паравозныя печы, кляпаць касу, кляпаць манеты*). У шырокую сэнсавую парадыгму гэтых слоў уключаюцца аказіянальныя пеяратыўныя ЛСВ наступнага зместу:

а) ‘стварыць што-небудзь вельмі хутка і няякасна’: *Надакучыла кляпаць новыя песні, якія проста забываюцца.* (А. Кулінковіч); *Выслухаў толькі яго няшчыры пункт гледжаньня і скляпаў артыкулік.* (С. Астраўцоў); *Можна лёгка скляпаць верш.* (П. Місько); *Гэта цяпер некаторыя аўтары кляпаюць так званыя тэксты за дзень-другі, у лепшым выпадку — за месяц.* (А. Савіцкі);

б) ‘прыдумаць’: *Адно цвёрда і пэўна надумаўся Пятро, вяртаючыся з атрада: парашутыста ён можа ўзяць у сваю кватэру. Месца хопіць, а хто ён, Пятроў госць, як прыбіўся сюды,— гісторыю скляпаць не цяжка.* (І. Кудраўцаў);

в) ‘даносіць, нагаворваць, тайна паведамляць’: *Трэба нам пагаварыць, каб трымацца аднаго фронту і не кляпаць адзін на аднаго.* (Я.Колас); *Любіў Бранчыцкі на кожнага скляпаць і падаткнуць куды-небудзь, каб з гэтага выгаду мець.* (К. Чорны);

г) ‘нарадзіць’: *Дзе ж гэта толькі і навошта такога дурня скляпалі? Няўжо каб зямельку дзерці?* (В. Казько);

д) ‘пабудаваць’: *Дзеўка – як дзеўка. І хлопец – як хлопец... Але як пабраліся, аддзялілі іх. Хатку сваяцтва скляпала. Сталі жыць сабе.* (І. Мележ); *Я ўсё пра алейню думаю, няўжо мы яе не скляпаем?* (К. Чорны);

е) ‘лёгка зарабляць’: *Яны займаюцца драбязой, кляпаюць баксы для сваёй уласнай кішэні і замінаюць нам ажыцяўляць важнейшыя стратэгіі.* (К. Травень).

Дзеяслоў *свідраваць* ужываецца ў вытворча-тэхнічных і прыродазнаўчых значэннях ‘рабіць свердлам адтуліны ў чым-небудзь’, ‘струменем вады пад вялікім ціскам прамываць адтуліны ў чым-небудзь’, ‘тачыць, прабіваць адтуліны ў чым-небудзь (пра расліны, жывёл і пад.)’ (*свідраваць жалеза, свідраваць адтуліны ў зямлі, свідраваць сцяну свердзелам, парасткі свідруюць пласт зямлі, дзяцел прабівае кару і свідруе драўніну*). Другасныя ЛСВ гэтага дзеяслова арыентаваны на выражэнне прасторавых, квантытатыўных, зрокавых, псіхалагічных уяўленняў, звязаных часцей за ўсё з чалавекам і прыроднай стыхіяй:

а) ‘пранізваць паветра, ваду рэзкім узлётам, хуткім вярчэннем’: *Толькі адны вушастыя начніцы, кажаны ў імклівым палёце нястомна свідруюць паветра, настоенае на гаркавым водары чабору і верасу.* (В. Гардзей);

*Параход плыве, мінае мелі, і ваду свідруе вінт.* (С. Ліхадзіеўскі); *Арлы-самалёты свідруюць прастор.* (Я. Купала);

б) ‘дзьмуць з вялікай сілай (пра вецер)’: *Холад там, сырасць і вецер свідруе.* (Я. Колас); *Захавай, мой сын, прашу я, човен у адрыне, няхай вецер не свідруе, няхай так не гіне.* (Я. Колас);

в) ‘непакоіць, хваляваць, мучыць (пра думкі, адчуванні)’: *Ад думак можна звар’яцець. Адганяеш іх, хочаш узбіцца на іншае, а свідруе адно: як там сям’я, чым пакаралі яе, куды выселілі з казённай хаты, як там маленькая дачушка?* (С. Грахоўскі); *Цяпер Раманавы мазгі свідравала адна думка, ці кахала Надзя яго.* (У. Федасеенка); *Але і ў сне нейкая думка, знаёмая і няўлоўная, свідравала мозг.* (У. Шыцік); *Адна толькі думка свідруе галаву: не заб’ю я, скінуць з сядла і заб’юць мяне.* (Л. Дайнека);

г) ‘раздражняць слых рэзкімі гукамі’: *Страшэнны, незразумелы мне гук свідруе вушы, пранізвае ўсяго наскрозь.* (І. Сяркоў); *Кожнаму хацелася стаіцца, хутчэй заснуць, каб толькі не лез у вушы, не свідраваў сэрца гэты сумны, халодны, трывожны, незразумелы і таму яшчэ больш страшны крык.* (Л. Дайнека); *Толькі свідраваў вушы востры, пранізлівы звон, ды рэзкімі, балючымі штуршкамі біла ў скроні кроў.* (А. Шашкоў);

д) ‘раздражняць нюх рэзкім пахам’: *Моцны пах ёдаформу, здавалася, свідраваў нос.* (Р. Сабаленка);

е) ‘пільна і ўважліва ўглядацца ў каго-, што-небудзь’: *Але пасажыр маўчаў, толькі свідраваў насцярожаным позіркам.* (М. Прохар); *Яго маленькія, празрыста-шэрыя вочкі свідравалі субяседніка.* (Ю. Станкевіч); *Шэрыя, глыбока пасаджаныя вочкі-калючкі свідравалі яго з непрыхаванай варожасцю, нават злосцю.* (В. Праўдзін); *Вочы канадыйскага мытніка свідруюць нашы твары.* (К. Акула); *Вочы свідравалі любую рэч, што знаходзілася ў хаце, позірк пранізваў усё наскрозь.* (А. Бароўскі).

## ДЗЕЯСЛОВЫ СТВАРЭННЯ ЦЭЛАСНАГА АБ’ЕКТА ЦІ ЯГО ВІДАЗМЯНЕННЯ

У залежнасці ад вынікаў дзейнасці дзеясловы могуць указваць на стварэнне новага цэласнага аб’екта (*шыць, каваць, будаваць*) ці яго канструктыўнае відазмяненне (*дэкарыраваць, грыміраваць, інкруставаць, перарабіць, адрамантаваць*). Дзеясловы са значэннем пэўнага відазмянення аб’екта практычна не падвяргаюцца працэсу семантычнай дэрывацыі і выкарыстоўваюцца ў сваіх першасных значэннях: *дэкарыраваць* ‘прыгожа аформіць што-небудзь (будынак, памяшканне, сцэну і пад.)’, ***інкруставаць*** ‘упрыгожыць узорамі, малюнкамі з урэзаных у паверхню пласцінак косці, перламутру, металу, дрэва і інш.’, *грыміраваць* ‘накладваць грым, надаваць з дапамогай грыму выгляд, аблічча каго-небудзь’, *рамантаваць* ‘праводзіць рамонт’.

Выключэннем з гэтага раду лексічных адзінак з’яўляецца дзеяслоў *перабраць* ‘адсартаваць, аддзяліць ад агульнай масы недабраякаснае,

іншароднае; разабраць па дэталях і сабраць нанава’, у сэнсавай структуры якога фіксуюцца другасныя ЛСВ квантытатыўнай скіраванасці: ‘узяць больш, чым трэба, занадта многа’, ‘зрабіць звыш меры’, ‘выпіць занадта многа’: *«Дык у вас жа няма грошай, – сказаў Собіч. – Вы нават перабралі ў бухгалтэрыі». (Я.* Скрыган); *«Вельмі перабярэш ты на рабоце», – думаў Васіль.* (М. Стральцоў); *Ты перабраў. Можа, табе і піць не трэба? (А. Глёбус); Няйнакш, перабраў учора — трашчыць галава.* (І. Кудраўцаў).

У мэтавай другаснай зоне гэтага дзеяслова часта фіксуюцца ЛСВ ментальнай і зрокавай кантэнтаў:

а) ‘уявіць у думках, успомніць, прайграць адно за адным, усё, многае’: *Ён перабраў у памяці ўсе драбніцы нядаўняй размовы з Галабурдам.* (А. Мальдзіс); *Настаўнік перабраў у памяці сваіх тутэйшых знаёмых.* (Я. Колас); *Карызна ў свядомасці перабіраў нізку думак, на якіх грунтавалася яго новае незамутнёна-чыстае самаадчуванне.* (М. Зарэцкі); *Затым перабраў у памяці ўсё, што я за апошні год зрабіў у калгасе і ў школе і што мне можа быць залічана за грамадскую актыўнасць.* (Н. Гілевіч);

б) ‘назіраць, сачыць, акідваць позіркам’: *Вася яшчэ раз перабраў усіх партызан вачыма, даўжэй спыніўся на Кастрыцыне.* (П. Місько); *Яна перабрала вачамі маладзіц.* (І. Чыгрынаў); *Коля і Толя прытулілі свае галовы да бабулінай, перабралі вачыма кожны каменьчык.* (П. Місько).

Такім чынам, дзеясловы стваральнай дзейнасці шырока прадстаўлены ў беларускім мастацкім дыскурсе. Яны ўтвараюць сістэму ўзаемаабумоўленых і ўзаемазвязаных элементаў рознага сэнсавага аб’ёму і фактычна адлюстроўваюць ўсе фрагменты пазамоўнай рэальнасці гэтага кірунку. У асобных выпадках у сферу стваральных дзеясловаў уцягваюцца кампаненты іншых тэматычных груп і тым самым папаўняюць дзеяслоўны корус . Так, гэты корпус папоўнілі дзеясловы руху ўверх, паветранай і воднай плыні: *узвесці* ‘заставіць узысці, падняцца наверх чаго-небудзь’ → ‘збудаваць, пабудаваць, паставіць’, *выдзьмуць* ‘выдаліць моцным струменем, плынню паветра’ → ‘вырабіць што-небудзь шляхам выдзімання’, *адліць* ‘выліць частку вадкасці з якой-небудзь пасудзіны’ → ‘вырабіць ліццём; выліць’.

Дзеясловы стваральнай семантыкі ўключаюцца ў клас дзеясловаў дзеяння, па прычыне чаго практычна ўсе зыходныя і пераносныя ЛСВ характарызуюцца акцыянальнасцю і выніковасцю. Большая іх частка характарызуецца здольнасцю да семантычнай дэрывацыі і ўтварэння другасных ЛСВ, якія ахопліваюць працоўную і творчую дзейнасць чалавека, яго ўнутраны псіхічны стан, сацыяльныя і міжасобасныя адносіны, экзістэнцыяльныя і ментальныя сферы і інш. У залежнасці ад характару працэсу стваральнасці дзеясловы падраздзяляюцца на групы з шырокай (аб’ёмнай) і вузкай (спецыялізаванай) семантыкай, групы, што ўказваюць на стварэнне новага цэласнага аб’екта ці толькі яго перабудову, канструктыўнае відазмяненне, групы з семантыкай фізічнай і эмацыянальнай дзейнасці.

Спецыфіка другасных стваральных ЛСВ заключаецца ў тым, што практычна ўсе яны характарызуюцца станоўчай канатацыяй, якая

адлюстроўвае пазітыўнае стаўленне да варажаемай дзеясловамі экстралінгвістычнай рэальнасці. Праўда, у асобных выпадках пераносныя ЛСВ утрымліваюць негатыўны змест, скіраваны на няякаснае выкананне працы, ілжывасць, несправядлівасць, паклёпніцтва (*прышыць, вязаць, плесці, зляпіць, ляпаць, свідраваць).*

Адной з рыс дзеяслоўных стваральных намінацый з'яўляецца наяўнасць пазітыўных і негатыўных ЛСВ. Як правіла, такія ЛСВ утвараюцца ў выпадку, калі актуальнае значэнне стварэння (ці разбурэння) набывае процілеглы энантыясемічны сэнс, калі канструктыўныя і дэструктыўныя значэнні аднаго слова функцыянуюць у розных кантэкстах: *рубіць* 'узводзіць будынак' ↔ 'забіваць, паражаць халоднай зброяй', *выпаліць* 'апрацаваць выраб пад уздзеяннем агню, вырабіць абпальваннем' ↔ 'знішчыць агнём', *высекчы* 'зрабіць, стварыць высечкай' ↔ 'ссячы ўсё, знішчыць'.

Дзеясловы стварэння адлюстроўваюць дзейнасць чалавека, накіраваную на стваральны працэс у матэрыяльнай і духоўнай сферах на карысць чалавека, прыроды і сусвету, на недапушчэнне безадказнасці, варварства ў справах і думках людзей, спажывецкіх адносін да прыроды. У вершы Анатоля Вярцінскага «Жыццё даецца, каб жыццё тварыць…» сфармулявана жыццесцвярджальная ідэя:

Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.
Каб светла-залатую яго ніць
віць і далей — любоўю, справай дзейнай
ды словам, што ад справы неаддзельна.
Тварыць!
Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.
Надзеяй, праўдай, мужным парываннем,
высакародным, дружным намаганнем,
што потым зоркай у вяках гарыць.
Тварыць!

І гэта ідэя аб тым, што чалавек павінен быць стваральнікам не толькі матэрыяльных рэсурсаў, але і духоўных каштоўнасцей, добрых і карысных спраў, высакародных учынкаў.